***А. І. Русаковіч, С. В. Елісеева***
Салігорскі дзяржаўны педагагічны каледж,
г. Салігорск, Рэспубліка Беларусь

# ДЭКАРАТЫЎНА-ПРЫКЛАДНОЕ МАСТАЦТВА ЯК СРОДАК ФАРМІРАВАННЯ ГРАМАДЗЯНСКА-ПАТРЫЯТЫЧНЫХ ЯКАСЦЕЙ У НАВУЧЭНЦКАЙ МОЛАДЗІ

Ад прадзедаў спакон вякоў
Мне засталася спадчына;
Паміж сваіх і чужакоў
Яна мне ласкай матчынай.

*Я. Купала*

Свая, цудоўная спадчына ў беларускага народа. Стагоддзямі беларусы ўзбагачалі і ўдасканальвалі, нягледзячы на цяжкія гістарычныя ўмовы, на ліхалецце войнаў, выраблялі ўзоры мастацтва, у якіх сцвярджалі свой эстэтычны ідэал, у якія ўкладвалі тонкі густ і высокае майстэрства. Адыходзіла і гублялася многае — лёс не песціў беларусаў. Але і тое, што засталося, раскрывае перад нашым сучаснікам па-мастацку дзівосны, па-філасофску мудры свет народа — пранікнёнага творцы і ашчаднага за хавальніка лепшага, таленавітага. Беларуская народная творчасць — паэма жыцця беларускага народа на ўсіх этапах гісторыі, трапяткое люстэрка яго душы, невычэрпная крыніца творчага натхнення і мастацкіх вобразаў.

Народ заўсёды, ва ўсім — мастак. Усе вырабы яго рук адухоўлены шчырасцю пачуцця, расквечаны цікавай выдумкай. Пры гэтым яны практычна і эстэтычна мэтазгодны, пазбаўлены выпадковага, штучнага. Таму творы народнага дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва ва ўсе часы былі і застаюцца бясспрэчнымі ўзорамі сапраўднага мастацтва, якое дзейсна ўплывае на сучасную культуру, яе далейшае развіццё і ўзбагачэнне.

Праз мастацкія вобразы і свет прадметаў дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва да навучэнцаў прыходзіць успрыняцце Радзімы, культуры народа, яго традыцый і звычаяў. Працэс выканання прыгожых і патрэбных вырабаў, уменне ствараць іх сваімі рукамі маюць вялікае значэнне для выхавання здаровага маральнага пачатку, павагі да сваёй працы і да людзей працы. Гуманізм і жыццясцвярджальная моц народнага мастацтва, чысціня яго вобразаў і сюжэтаў, паэтычная мова арнамента, унікальнасць тэхнічных прыёмаў, даступнасць успрымання

Рэпазіторый БарДУ

ў многім садзейнічае фарміраванню светаўспрымання, нацыянальнай самасвядомасці навучэнцаў, вызначэнню свайго «я» у жыцці [5, с. 4].

Вывучэнне, зберажэнне і развіццё народнага мастацтва разглядаецца сёння не толькі як важная народна-гаспадарчая, але і духоўная задача, вырашэнне якой мае непасрэдныя адносіны да нацыянальна-культурнага адраджэння Беларусі.

Адна з важнейшых праблем на сучасным этапе адраджэння нацыянальнай культуры Беларусі — гэта, перш за ўсё, станаўленне нацыянальнай самасвядомасці народа, вывучэнне вытокаў развіцця свайго этнасу.

Паспяховае рашэнне гэтай праблемы магчыма толькі пры ўмове звароту да багатай і невычэрпнай мастацкай спадчыны, у тым ліку і да дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва — аднаго з самых традыцыйных і распаўсюджаных відаў нацыянальнай культуры. У народным дэкаратыўна-прыкладным мастацтве ўвасобілася неабсяжная і вечна жывая душа народа, багаты, запашаны стагоддзямі практычны вопыт і эстэтычны густ [4, с. 3], менавіта таму народнае мастацтва мае вялікія выхаваўчыя магчымасці: садзейнічае гарманічнаму развіццю ў чалавека ўсіх прыродных сіл і схільнасцей.

Адна з задач, што вырашаецца ва УА «Салігорскі дзяржаўны педагагічны каледж», — гэта развіцце ў навучэнцкай моладзі нацыянальных думак, паглыбленне нацыянальнай свядомасці, далучэнне да традыцыйнага народнага мастацтва.

Заняткі па дэкаратыўна-прыкладным мастацтве разглядаюцца як адзін з сродкаў нацыянальна-патрыятычнага выхавання і развіцця творчай асобы навучэнца. Ва ўстанове адукацыі навучэнцы атрымліваюць падрыхтоўку па спецыяльнасці «Дэкаратыўна-прыкладное мастацтва». На занятках яны вывучаюць віды дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва — мастацкую апрацоўку саломкі, мастацкую апрацоўку тэкстыльных матэрыялаў, мастацкую апрацоўку дрэва. Гэта ажыццяўляецца шляхам вывучэння традыцый, семантыкі старадаўніх арнаментаў, праз аналіз вобразаў, сімвалаў, сінтэз усіх відаў народнага мастацтва.

Вельмі важным і значным для беларусаў заўсёды з’яўляўся такі від народнага мастацтва, як беларуская вышыўка, якая ўвасабляе яркія нацыянальныя рысы і адначасова захоўвае найстаражытнейшыя агульнаславянскія арнаментальныя пласты.

У гісторыі развіцця вышыўкі былі перыяды спаду і ўздыму, часы цікавасці да сюжэтных ці арнаментальных кампазіцый, расліннага ці геаметрычнага арнамента, танальнай шматкаляровасці ці манахромнай стрыманасці. Была мода на пэўныя тэхнічныя прыёмы

Рэпазіторый БарДУ

і схільнасць да аздаблення асобных прадметаў. Быў заўсёдны, няўмольны рух. Наш час, як ніколі раней, адчувае патрэбу ў такіх прадметах. Навучэнцы каледжа спасцігаюць таямніцы рукатворнага майстэрства, вучацца ў папярэдніх пакаленняў і адначасова ствараюць непаўторныя, адэкватныя сваім імкненням і эстэтычнаму развіццю творы.

Арганізацыя заняткаў па вышыўцы адкрывае вялікія магчымасці педагагічнай дзейнасці, у якой закладзены ўсе бакі выхаваўчай і творчай дзейнасці з навучэнцамі. Дапамагчы разабрацца ў розных тэхнічных прыёмах народнага мастацтва, яго назначэнні і каранях, данесці прыгажосць да сэрца, развіць імкненне да самастойнай творчасці, абудзіць цікавасць да культуры беларускага народа — вось галоўная задача і абавязак педагога.

Пры выбары тэм, іх вобразным вырашэнні, арнаментальнай сімволіцы навучэнцы абавязкова кіруюцца традыцыямі свайго народа. З мэтай пашырэння аб'ёму ведаў аб традыцыйнасці народнай творчасці на занятках адбываецца азнаямленне навучэнцаў з творамі па вышыўцы, іх сюжэтамі, матывамі, што выбіралі майстры пры выкананні сваіх вырабаў. Напрыклад, такія матывы, як сонца, жанчына, птушка, расліны сустракаюцца і ў вышыўцы, і ў аплікацыі саломкай, і ў саломапляценні. Яны сімвалічна адлюстроўваюць уклад жыцця, якому падпарадкоўваўся беларус-земляроб.

Народнае мастацтва дапамагае навучэнцам разумець сугучнасць сялянскага жыцця і прыроды. Вобраз маці-зямлі, што паіла, карміла і апранала, абагулены і замацаваны ў шматлікіх жаночых фігурах, з якіх ствараюцца матывы для вышыўкі. У афармленні вышываных вырабаў адлюстроўваюцца любімыя беларусамі геаметрычныя арнаменты, якія ўключаюць варыяцыі трохвугольнікаў, квадратаў, прамавугольнікаў, ромбаў, зорачак, ломаных ліній, а таксама раслінных узораў.

Пачынаецца навучанне вышыўцы з простых дэкаратыўных швоў і варыянтаў іх выканання: «уперад іголку», «назад іголку», сцяблістае, тамбурнае, «козлік», аксамітнае, навіўка, пяцельнае, «васьмёрка» і інш. Вельмі важна, каб навучэнцы авалодалі навыкам чытаць і замалёўваць схемы швоў. Гэта развівае прасторавае мысленне і самастойнасць у працы. Паступова веды і ўменні навучэнцаў паглыбляюцца. Яны ствараюць асабістыя творчыя работы, у якіх дэманструюць сваё майстэрства і мастацкі густ.

Праз індывідуальныя заняткі навучэнцам прадастаўляецца магчымасць азнаёміцца з такімі відамі вышыўкі, як вышыўка стужкамі, бісерам. Такім чынам пашыраюцца веды навучэнцаў аб мностве спосабаў мастацкага афармлення тэкстыльных матэрыялаў,

Рэпазіторый БарДУ

аб гісторыі ўзнікнення і развіцці самых распаўсюджаных тэхнік вышывання, развіваецца мастацкі густ, практычнае майстэрства, ствараюцца непаўторныя па прыгажосці творы.

Цікавасць грамадства да фальклору, народнага мастацтва і рамёстваў выклікана пошукамі шляхоў аднаўлення парушаных сувязяў чалавека і прыроды, вяртанне ў культуру традыцый пераемнасці пакаленняў, а таксама ідэяй нацыянальнага адраджэння.

Багатыя народныя традыцыі з’явіліся жыватворнай глебай для незвычайнага ўзлёта мастацтва апрацоўкі саломкі.

Комплексны падыход да авалодання рамяством мастацкіх вырабаў з саломы прапануецца на занятках «Мастацкая апрацоўка саломы». Навучэнцы маюць магчымасць не толькі авлодаць практычнымі уменнямі і навыкамі саломапляцення і аплікацыі саломкай, але і адначасова з гэтым — грунтоўна вывучыць карані і гісторыю рамяства, яго традыцыі, нацыянальныя адметнасці.

На занятках навучэнцы асвойваюць розныя віды і спосабы пляцення з саломы, распрацоўваюць эскізы будучага твора ў адпаведнасці з законамі кампазіцыі і, ўлічваючы нацыянальныя традыцыі, вучацца паслядоўна і граматна выканваць работу: ў парадку паступовага ўскладнення ад прасцейшых практыкаванняў па пляценню саламяных стужак, стылізацыі аб’ектаў расліннага і жывёльнага свету да пляцення традыцыйнай народнай і сучаснай беларускай дэкаратыўнай скульптуры (лялькі, птушкі, коні і інш.), а таксама выкананню складаных сюжэтна-тэматычных кампазіцый у тэхніцы аплікацыі саломкай («Дрэва жыцця», «Беларускія святы», «Беларускія абрады», і інш.). Таксама навучэнцы маюць магчымасць прыняць ўдзел у каляндарных абрадавых святах, дзе уключаюцца праз рамяство ў гадавое кола каляндарных абрадаў земляробчага цыкла, якому да нядаўняга часу было падпарадкавана ўсё жыццё нашых продкаў — беларускіх сялян. Адначасова праз выраб розных рэчаў з саломы, ўлічваючы народныя традыцыі, навучэнцы далучаюцца да саміх каранёў гэтага майстэрства і рамяства, найбольш глыбока пазнаюць яго сінкрэтычны характар і непарыўную сувязь з усім ладам жыцця нашых продкаў у мінулым, з кругаваротам пораў года, залежнасцю чалавечага лёсу ад прыроды.

Усе заданні па авалоданню рамяством мастацкай апрацоўкі саломы ўзаемазвязаны, што дае ў працэсе навучання комплекс ведаў і навыкаў, якія адпавядаюць вырашэнню пастаўленых задач.

Аснова рамяства, засвоеная навучэнцамі ў працэсе навучання, дазволіць ім самастойна ўдасканальваць майстэрства, шукаць свае шляхі ў мастацтве саломапляцення і аплікацыі саломкай.

Рэпазіторый БарДУ

Навучанне мастацкай апрацоўцы дрэва таксама адыгрывае значную выхаваўчую ролю ў фарміраванні ў сучаснай моладзі, адарванай ад натуральных форм жыцця і прыроды, экалагічнай свядомасці, дапамагае выпрацаваць пэўныя нормы паводзін у адносінах да прыроды, свайго краю, выхоўваць павагу і гонар да сваёй Радзімы. Гэта адзін з любімых і традыцыйных відаў народнай творчасці, які ўключае роспіс па дрэве, разьбу, лозапляценне. У выніку засваення рамяства навучэнцы атрымліваюць комплекс ведаў і навыкаў, якія спрыяюць не толькі авалоданню пэўнымі рамёствамі, але і рашэнню вучэбных і выхаваўчых задач, накіраваных на развіццё якасцей, неабходных для фарміравання нацыянальнай самасвядомасці, магчымасці атрымаць у спадчыну духоўны вопыт пакаленняў, прыгажосць традыцыйнай культуры і мастацтва.

У прыродзе народнага мастацтва, традыцыйнага рамяства закладзена магчымасць далучыцца да яго вытокаў кожнаму, хто пажадае. На працягу тысячагоддзяў фарміраваўся мастацка-рамесніцкі комплекс прыёмаў, спосабаў апрацоўкі матэрыялу, у якім няма нічога складанага для чалавека, які мае рукі і жаданне авалодаць ім. У гэтым вялікая і цудоўная адметнасць народнага мастацтва, да якога заўсёды можа далучыцца кожны.

Аднак няўмольны час робіць сваё. Большасць традыцыйных самаробных прылад працы, прадметаў побыту, рэчаў хатняга ўжытку адышлі ў нябыт, саступілі месца прамысловым вырабам. Але нельга дапусціць, каб разам з імі адышлі ў нябыт узоры народнай мастацкай творчасці. Гэта наш нацыянальны здабытак, аснова для развіцця сучаснай культуры. Трэба рабіць усё, каб выявіць, сабраць, зберагчы тыя ўзоры народнай мастацкай творчасці, якія яшчэ захоўваюцца ў традыцыйным побыце.

Выключна вялікую ролю ў пошуку і даследванні маральнага свету чалавека аказвае мастацтва. І калі мы разважаем аб неабходнасці якасна іншых адносін сучаснага маладога пакалення да мастацтва і ўспрымання мастацкіх твораў, то перш за ўсё маем на ўвазе вострую патрэбу ў далучэнні да духоўнай скарбніцы і глыбокае асэнсаванне ўздзеяння твораў народнага дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва.

Пераасэнсаванне ідэалаў і фарміраванне каштоўнасных арыентацый у сучасным асяроддзі — вельмі складаны працэс.

Грамадзянскасць і патрыятызм выхоўваюцца пад уплывам лепшых твораў народнага дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва. Яны сапраўды з’яўляюцца ўрокамі сумлення, гонару, справядлівасці.

Рэпазіторый БарДУ

Зварот да іх, гэтак жа, як і да гісторыі, — перш за ўсё зварот да мінулага сваёй Радзімы, свайго народа. Толькі той, хто любіць, ацэньвае і паважае ўсё, што назапашана і захавана папярэднімі пакаленнямі, можа стаць сапраўдным патрыётам.

### Спіс крыніц


1. *Высоцкая, Н. Ф.* Дэкаратыўна-прыкладное мастацтва Беларусі XII—XVIII ст. / Н. Ф. Высоцкая. — Мн. : [б. в.], 1984.
2. *Кацар, М. С.* Беларускі арнамент : Ткацтва. Вышыўка / М. С. Кацар ; пер. з рус. мовы, літ. апрац. і навук. рэд. Я. М. Сахуты. — 2-е выд. — Мн. : Беларус. энцыкл. імя П. Броўкі, 2009. — 224 с. : іл.
3. *Лобачевская, О. А.* Возьми простую соломку / О. А. Лобачевская — Минск : Полымя, 1988. — 142 с. : іл.
4. *Ляшэвіч, Л.* Крок да XXI стагоддзя / Л. Ляшэвіч // Асновы мастацтва. — 2002. — № 6. — С. 73—75.
5. *Молотобарова, О. С.* Учите детей вышивать : учеб. пособие для студентов учреждений сред. проф. образования / О. С. Молотобарова. — М. : ВЛАДОС, 2003. — 192 с. , 16 с. ил.: ил.
6. *Сахута, Я. М.* Беларускае народнае дэкаратыўна-прыкладное мастацтва / Я. М. Сахута. — 2-е выд., перапрац. і дап. — Мн. : Беларусь, 2001. — 110 с. , іл.
7. *Фадзеева, В. Я.* Беларускі ручнік / Афарм. І. А. Дзямкоўскага, В. Я. Фадзеева — Мн. : Полымя, 1994. — 327 с. , іл.



Материал поступил в редакцию 17.05.2011.



***А. С. Зимульдінова,***
***Г. О. Філь, І. М. Кутняк***
Дрогобицький державний педагогічний
університет ім. І. Франка,
м. Дрогобич, Україна


# ТЕХНОЛОГІЯ ВЗАЄМОЗВ’ЯЗКУ ОБРАЗОТВОРЧОГО МИСТЕЦТВА ТА ЧИТАННЯ НА УРОКАХ В ПОЧАТКОВИХ КЛАСАХ

**Актуальність дослідження.** Одним із основних завдань загальноосвітньої школи є формування художньої культури школярів як невід’ємної частини їх духовної культури. Під художньою культурою особистості розуміється її здатність до активного засвоєння й створення світу художніх цінностей [8, с. 143]. У сучасних умовах це



Репозиторий БарГУ